Однако Лондон не единственный город, разделённый на «верх» и «низ». В романе упоминаются и другие города мира: Нью-Йорк, Берлин, Калькутта, Бангкок, каждый имеет под землёй Зверя. Отсюда можно предположить, что каждый крупный город мира, в котором есть метро, так же делится на Верхний и Нижний со своим Зверем.

В романе упоминается ангел Ислингтон оказывшийся не таким добрым, каким он кажется в начале. Ислингтон приказал Крупу и Вандемару, наёмным убийцам, расправиться с отцом Двери из собственных интересов. Ангел и есть отражение контраста «добро/зло».

**Заключение.** В целом любой сюжетный ход в повести алогичен, не мотивирован, и именно потому фантастичен. Разные формы фантастики могут сочетаться друг с другом в системе одного произведения. Антитеза является одним из самых часто используемых художественных языковых средств в романе.

Автор противопоставляет реальность и ирреальность, обычное и необычное, верх – низ, добро – зло, свет – тьма, но поскольку роман «Никогде» относится к жанру городского фэнтези, то наиболее частотной является антитеза «реальный и вымышленный миры».

1. Никогде : роман / Нил Гейман ; пер. с англ. Н. Конча, М. Мельниченко. – Москва: АСТ, 2015. – 416 с.
2. Поэтика. Риторика / Аристотель [Вступ. ст. и коммент. С.Ю. Трохачева; пер. с греч. В. Аппельрота, Н. Платоновой]. – СПб.: Азбука, 2000. – 346 с.

## НЕКАТОРЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ЎЖЫВАННЯ ЛЕКСІКІ СА СФЕРЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ У «НАСТАЎНІЦКАЙ ГАЗЕЦЕ»

***Прышчэпа Ю.Ф.,***
*магістрант ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Бабіч Ю.М., канд. філал. навук, дацэнт

Сёння ў свеце назіраюцца ўсеагульныя працэсы глабалізацыі, актыўная інтэграцыя навуковых напрамкаў, імклівае развіццё інфармацыйных тэхналогій (ІТ). Рэвалюцыя ў галіне ІТ ва ўсім свеце выклікала з’яўленне ў мове значнай колькасці спецыяльнай лексікі (тэрмінаў, гутарковых слоў, жарганізмы). Дынамізм, разнастайнасць, пастаяннае абнаўленне лексічных адзінак сферы ІТ прыцягвае ўвагу навукоўцаў.

Актуальнасць даследавання абумоўлена пастаянным пашырэннем камп’ютарнай лексікі на старонках перыядычных выданняў і, у прыватнасці, ў «Настаўніцкай газеце», якая выходзіць на беларускай мове і пазіцыянуецца як выданне для настаўніка і пра настаўніка.

Мэта артыкула – выявіць асаблівасці ўжывання спецлексікі ІТ і раскласіфікаваць лексічныя адзінкі паводле лексіка-семантычных груп.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання выступаюць неалагізмы са сферы інфармацыйных тэхналогій, зафіксаваныя намі ў «Настаўніцкай газеце». Метады даследавання – апісальна-класіфікацыйны, метад кампанентнага аналізу.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Камп'ютарныя тэхналогіі ўсё больш і больш укараняюцца ў сучаснае жыццё, таму ў нашу мову дадаюцца многія звязаныя з імі словы. Адзначым, што з шырокім развіццём найноўшых тэхналогій настаўнікі Беларусі актыўна займаюцца распрацоўкай методык навучання, выкарыстаннем электронных сродкаў, адукацыйных праграм. Патрымліваючы неафіцыйную назву Беларусі ў навуковай прасторы як “ІТ-краіны”, настаўнікі актыўна дзеляцца вопытам выкарыстання ІТ у адукацыйным працэсе на старонках «Настаўніцкай газеты».

Камп’ютарная лексіка можа разглядацца з пазіцыі лексіка-семантычнага поля, пад якім традыцыйна разумеецца група слоў, цесна звязаных адзін з адным па сэнсе, або іерархічная структура мноства лексічных адзінак, аб'яднаных агульным значэннем і якая адлюстроўвае ў мове пэўную паняційную сферу.

Аналіз даследаванага матэрыялу дазволіў нам вылучыць наступныя лексіка-семантычныя групы неалагізмаў:

а) праграмныя прадукты (software): **браўзер, уціліта, плагін, сімулятар, архіватар**. *З дапамогай **плагіна** мы стварылі малюнкі для тэхналогіі дапоўненай рэальнасці* (18.05.2019); *Сёння мы прымяняем **сімулятар**, які ім быў распрацаваны, для правядзення кліматычных урокаў у школе і ўніверсітэтах* (28.11.2019); ***Google-карта** на ўроку дапамагала развіваць памяць, мысленне, уважлівасць, адпрацоўваць картаграфічны матэрыял* (19.01.2019).

b) карыстальнік або праграміст (user, programmer): **мадэратар, тэсціроўшчык, інтэрнэт-маркетолаг, SMM-спецыяліст.** *Можа было атрымаць уяўлені б розных **IT-прафесіях** і паспрабаваць сябе ў ролі **робататэхніка**, **тэсціроўшчыка** ці **распрацоўшчыка** праграмнага забеспячэння, **gamedev-спецыяліста** ці **вэб-дызайнера*** (21.02.2019); *Вельмі важная роля – **мадэратар*** (12.11.2019).

c) Інтэрнэт (Internet): **вэб, Google-карта, акаўнт, відэахостынг, блог, спам**. *Праграмы навучання педагогаў, уключаюць пытанні выкарыстання новых трэндаў у сучаснай адукацыі, такіх як сацыяльныя медыя, **воблачныя сэрвісы** і інструменты Google, **падкасты** для распаўсюджвання гукавых файлаў або*



Репозиторий ВГУ

*відэа ў сетцы інтэрнэт,* ***блогі, відэахостынг*** *YouTube, перавернутае навучанне,* ***гейміфікацыя*** *(навучанне з дапамогай адукацыйных гульняў),* ***Smart-навучанне****, заснаванае на ўжыванні мабільных прылад у адукацыйным працэсе* (17.09.2019); ***Вэб-квест*** *– гэта яшчэ адна ўнікальная магчымасць выкарыстання сусветнай сеткі для навучання* (21.11.2019).

Асобна разгледзім падобныя па семантыцы неалагізмы **вэбінар** і **хакатон**.

**Анлайн-семінар ці вэбінар** (англ. *webinar*) – гэта разнавіднасць вэб-канферэнцыі, правядзенне анлайн-сустрэч або прэзентацый праз Інтэрнэт. ***Вэбінар*** *– гэта аналаг жывога семінара, толькі ў рэжыме анлайн (18.05.2019).*

**Хакатон** (англ.: hackathon, ад hack – абчэсваць і marathon – марафон) — форум распрацоўшчыкаў, падчас якога спецыялісты з розных галін распрацоўкі праграмнага забеспячэння (праграмісты, дызайнеры, менеджары) разам вырашаюць якую-небудзь праблему і абмежаваныя ў часе: *Конкурсы, дзе школьнікі правяраюць свой узровень і* ***хакатоны****, падчас якіх можна гэты ўзровень павышаць, а таксама атрымліваць* ***soft skills*** (21.09.2019).

Працэс фарміравання інтэрнэт-утварэнняў у мове просты, але адначасова і высокатэхналагічны, бо самі тэхналогіі камунікацый з'яўляюцца прычынамі з'яўлення новых слоў. Як паказваюць назіранні, неалагізмы ўтвараюцца з дапамогай унутраных спосабаў намінацыі (напрыклад, словаскладанне, абрэвіяцыя) ці знешніх (запазычанне). Значную частку неалагізмаў камп'ютарнай сферы складаюць англіцызмы або раннія запазычанні, якія валодаюць высокім парогам выжывальнасці і здольнасцю да пашырэння лексіка-граматычнай парадыгмы.

Інтэрнэт-дыскурс на сённяшні дзень з'яўляецца адной з асноўных крыніц, якая папаўняе беларускую мову шматлікімі поліфункцыянальнымі лексемамі. Разгледзім абрэвіятуру **IT** [англ.: Information Technologies], якая актыўна ўжываецца ў "Настаўніцкай газеце: *Стартуюць у* ***IT*** (3.01.2019); *Пры падрыхтоўцы будучых педагогаў мы фарміруем адну з найважнейшых кампетэнцый –* ***IT-кампетэнтнасць; IT*** *узросты ўсе пакорныя* (21.11.2019).

Мы назіраем цікавую з'яву – несупадзенне формы напісання і гучання: IT – [ай-ці] і русіфікаваны графічны варыянт ИТ – [і-тэ], які шырока распаўсюджаны ў друку. У вусным маўленні гэтая абрэвіятура захоўвае сваё арыгінальнае гучанне.

Адзначым, што ўжыванне камп'ютарнай лексікі асобамі розных сфер дзейнасці спараджае т.зв. камп'ютарныя жарганізмы, якія актыўна ўжываюцца на старонках "Настаўніцкай газеты", напрыклад: *Як стаць паспяховай* ***айцішніцай?*** (16.11.2019); *Будучыя настаўнікі вучацца* ***хакатоніць*** (20.04.2019); *Пра што* ***стрыміць*** (18.05.2019).

Таксама ў артыкулах аўтары, часцей за ўсё настаўнікі школ і гімназій, ужываюць вобразныя назвы дзяцей XXI стагодзя: *У рубрыцы "Школа Z" мы працягваем даследаваць* ***"лічбавых" дзяцей*** *– новае пакаленне, што не прызнае аўтарытэтаў, не ўяўляе сваё жыццё без тэхналогій і рыхтуецца жыць у будучыні, якую сёння складана нават уявіць* (19.01.2019); *Ужо год мы гутарым пра выкарыстанне камп'ютарных тэхналогій у выхаванні, пра камунікацыю з новым, незнаёмым* ***і Пакаленнем*** (21.09.2019).

**Заключэнне.** Такім чынам, мы высветлілі, што камп'ютарная лексіка – з'ява параўнальна новая, яна перажывае вельмі інтэнсіўнае развіццё, набывае ўстойлівасць і замацоўваецца ў моўнай практыцы карыстальнікаў камп'ютара і Інтэрнэту. Разам з тым неабходна памятаць і пра нормы літаратурнай мовы, не забывацца пра тое, калі дапушчальнае ўжыванне падобнай лексікі. Журналістам варта ўлічваць жаданне чытачоў на атрыманне жывой, цікавай і дакладнай інфармацыі, выяўленай у форме, якая адлюстроўвае моўны густ і моўныя прыярытэты аўтара.

1. Лексічныя працэсы ў беларускай мове канца XX – пачатку XXI стст. / В.І. Уласевіч, Н.М. Даўгулевіч // Слоўнік новых слоў беларускай мовы. − Мінск, 2009. – С. 3–12.

## НЕЛІТАРАТУРНАЯ ЛЕКСІКА Ў ІНТЭРНЭТ-СМІ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ІНТЭРНЭТ-ЧАСОПІСА "34MAG.NET")

***Радзеўская Н.У.,***
*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Семянькова Г.К., канд. філал. навук, дацэнт

Сёння ў межах культуры маўлення і лінгвастылістыкі асаблівая ўвага надаецца праблеме апраўданасці нелітаратурнай лексікі ў СМІ. Асаблівага даследавання патрабуе лексіка публіцыстычнага тэксту ў інтэрнэт-прасторы. У сувязі з гэтым вывучэнне асаблівасцяў зместу і структуры інтэрнэт-публікацый з'яўляецца актуальным, бо дазваляе выявіць тэндэнцыі да змянення традыцыйных прынцыпаў стварэння публіцыстычнага твора.

Мэта артыкула – выяўленне ролі нелітаратурнай лексікі ў інтэрнэт-часопісе "34mag.net".

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для даследавання паслужылі публікацыі (каля 200) з інтэрнэт-часопіса "34.mag.net" за 2019 год. Метады даследавання – апісальны, параўнальны, элементы статыстычнага аналізу.